*М.Л.КУЗЬМІНІЧ*

# ТЭРМІНАСІСТЭМА ПЕДАГАГІЧНАЙ НАВУКІ: ТРАНСФАРМАЦЫЯ АСНОЎНЫХ ПАНЯЦЦЯЎ І ІХ УЗАЕМАСУВЯЗЕЙ

Паняцце "адукацыя" з'яўляецца цэнтральным у педагагічнай навуцы. Аднак у навукова-педагагічнай літаратуры ў адных выпадках яно разам з паняццямі "выхаванне" і "навучанне" ўжываецца як роўнае ці блізкае ім па значэнні, у другіх выпадках выяўляюцца розныя трактоўкі аднаго і таго ж паняцця, яго значэнняў у шырокім і вузкім сэнсах. Так, тэрмін "адукацыя" вызначаецца як працэс, вынік, сістэма, сацыяльны інстытут, паслуга, каштоўнасць і інш. Зразумела, што ўдакладненне зместу паняццяў, высвятленне іх суадносін з іншымі навуковымі катэгорыямі – важнейшая ўмова даследавання адукацыйных працэсаў.

Паняцці "адукцыя", "выхаванне", "навучанне" першапачаткова мелі бытавы, жыцейскі сэнс. Расійскія навукоўцы (А.У.Далжэнка, І.А.Зімняя, В.С.Ляднёў) вытокі паняцця "адукацыя" (рус. *образование*) шукаюць у *эпасе* ранняга сярэдневякоўя, калі яно да таго ж мела і пэўны рэлігійны сэнс – стварэнне чалавека "по образу и подобию Божию». Значэнне гэтага вобраза і трактавалася ў хрысціянскім праваслаўным веравызнанні як «образование» (вобразастварэнне, вобразаўвасабленне).

У эпоху Адраджэння (з XIУ ст.) у Еўропе распаўсюджваецца свецкая адукацыя. Чалавек выступае як найвышэйшая каштоўнасць жыцця, а адукацыя становіцца сродкам гарманізацыі адносін чалавека з прыродай і грамадствам, шляхам яго самаразвіцця, асваення сукупнасці сацыяльна-культурных адносін. Адукацыя выступае спосабам стварэння ўласнага вобраза, уласнай асобы праз асваенне культуры.

У навуковы ўжытак паняцце "адукацыя" ўвёў швейцарскі педагог І.Г.Песталоцці (1746–1827) – аўтар тэорыі элементарнай адукацыі, якую ён вызначаў як "правільнае гарманічнае развіццё" разумовых, фізічных, маральных задаткаў чалавека і здольнасцей да працы [5, с.338]. Ён пад адукацыяй (ням. *Bildung*) разумеў яе натуральны сэнс – фарміраванне вобраза (духоўнага і цялеснага). У гэтым жа сэнсе разумеў адукацыю ў пачатку XIX ст. рускі асветнік-дэмакрат, пісьменнік і журналіст М.І.Навікоў (1744–1818). Але працяглы час паняцце "не мела дакладна акрэсленага зместу і да першай паловы XIX ст. выступала як сінонім выхавання" [17, с. 100,101].

Нават у другой палове XIX ст. заснавальнік рускай навуковай педагогікі К.Д.Ушынскі (1824–1870) у "Программе педагогики для специальных классов женских учебных заведений» (1870) ні разу не згадвае катэгорыю "адукацыя". У раздзеле "Дыдактыка" ён вылучае паняцці "навучанне", "вучэнне", называе два розныя віды вучэння: "1) учение *пассивное* – посредством преподавания, 2) учение *активное* – посредством собственного опыта" [16, с.386]. У праграме ўжыты таксама паняцці "выхаваўчая дзейнасць", "выхаванне", "развіццё", "развіваючае выхаванне", "індывідуальнае і грамадскае выхаванне", але адсутнічае паняцце "адукацыя".

У іншых працах Ушынскага таксама дамінуе паняцце "выхаванне". Ён піша, што асноўнай задачай выхавання з'яўляецца падрыхтоўка чалавека да жыцця, што выхаванне павінна даваць дзецям "рэальную адукацыю", "развіваць іх разумовыя здольнасці", што жанчыне павінна быць забяспечаны "выхаванне і адукацыя на адным узроўні з мужчынам".

У навуковы абарот у рускай педагогіцы паняцце "адукацыя" ў яго сучасным разуменні ўвёў педагог і псіхолаг П.Ф.Капцэраў (1849–1922), які ў працы «Дидактические очерки. Теория образования» (М., 1885) вызначае гэтае паняцце як сукупнасць навучання і выхавання [4].

У англамоўнай педагагічнай літаратуры (ЗША, Вялікабрытанія і іншыя еўрапейскія краіны) паняцце адукацыі абазначаецца словам "education". Гэтае паняцце ахоплівае ўсе аспекты педагагічнага працэсу, уключаючы навучанне і выхаванне ў іх непадзельным адзінстве.

У СССР педагогіка развівалася як тэорыя камуністычнага выхавання. Пры гэтым змест асноўных паняццяў (адукацыя, навучанне, выхаванне і інш.) не з'яўляўся стабільным. Звычайнай справай пры напісанні навукова-педагагічных прац было цытаванне класікаў марксізму-ленінізму, што таксама не спрыяла ўдакладненню зместу паняцця "адукацыя". Аўтараў перш за ўсё цікавілі не змест і суадносіны педагагічных паняццяў, а патэнцыял адукацыйнай сферы ў рэвалюцыйным пераўтварэнні свету. Таму ў сваіх працах яны пісалі аб тым, што «требуется определенное образование или воспитание… для того, чтобы преобразовать человеческую природу …» [10, с.45]; ці «...надо, чтобы все дело воспитания, образования и учения современной молодежи было воспитанием в ней коммунистической морали» [8, с. 128].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У розных артыкулах і выступленнях У.І.Леніна побач ужываюцца наступныя паняцці: навучанне, выхаванне і адукацыя [8, с. 55, 273], выхаванне і адукацыя [8, с. 56], выхаванне, навучанне і падрыхтоўка [8, с. 75], асвета, падрыхтоўка, навучанне, выхаванне [8, с. 188], выхаванне, навучанне і дысцыплінаванасць [8, с. 195], агульная і політэхнічная адукацыя [8, с. 207], усебаковая і камуністычная адукацыя [8, с. 208], адукацыя і асвета [8, с. 213]. Прыстасаванне педагагічнай тэорыі пад ленінскія цытаты вяло да блытаніны ў паняццях. Натуральна, у канцы 1920 – пачатку 1930-х гг. у друку разгарнулася дыскусія аб асноўных паняццях савецкай педагогікі.

У той жа час найбольш дакладнае азначэнне паняцця "адукацыя" даў народны камісар асветы А.В.Луначарскі, які ў прамове "Что такое образование?" (1918) падкрэсліў: «Наше слово "образование", как и немецкое "Bildung", происходит от слова "образ"… Образованный человек – человек, в котором доминирует образ человеческий» [9, с. 354].

Сэнс паняцця "адукацыя" ўдакладняўся, мяняўся, і ў рэшце рэшт яно амаль поўнасцю было заменена тэрмінам "выхаванне" ў шырокім сэнсе слова. Гэтыя дзве катэгорыі пачалі выкарыстоўвацца ў многіх работах як сінонімы ці вельмі блізкія па сэнсе для абазначэння цэласнага выхаваўчага працэсу.

Удакладненне паняццяў і тэрмінаў з'яўляецца натуральнай тэндэнцыяй развіцця педагагічнай навукі, што знайшло адлюстраванне ў шэрагу дыскусій, у вучэбных дапаможніках па педагогіцы і спецыяльных публікацыях (Ф.Ф.Каралёў, І.М.Кантар, Б.Б.Камароўскі, В.С.Ляднёў і інш.). Удакладненню паняційна-тэрміналагічнага апарату педагагічнай навукі садзейнічала выданне "Педагогического словаря" (М., 1966), "Педагогической энциклопедии" (М., 1964–1968). У большасці выпадкаў «адукацыя» пачала трактавацца як «процесс и результат усвоения систематизированных знаний, умений и навыков», а навучанне як «основной путь получения образования… в системе различных учебных заведений» [12, с. 141].

Сярод педагагічных прац 1960-х гг. вылучаецца кніга савецкага педагога і псіхолага Л.У.Занкова "Дидактика и жизнь" (М., 1968), дзе, на наш погляд, найбольш дакладна раскрываюцца суадносіны паняццяў "навучанне", "выхаванне" і "развіццё". Паводле меркавання вучонага, працэс навучання непасрэдна скіраваны на засваенне навучэнцамі вопыту. А выхаванне і развіццё здзяйсняюцца апасродкавана; павышэнне эфектыўнасці навучання павінна быць скіравана на выхаванне і развіццё навучэнцаў; для гэтага і па- трабуецца адпаведная пабудова навучальнага працэсу [2].

У навукова-педагагічных працах 1970–80-х гг. зноў адзначаецца блізкасць ці супадзенне названых паняццяў. Недакладна раскрываліся суадносіны адукацыі з выхаваннем і развіццём (у вузкім сэнсе гэтых паняццяў), на што звяртала ўвагу створаная ў Акадэміі педагагічных навук СССР тэрміналагічная камісія. Пра двайны сэнс, які закладзены ў паняццях "адукацыя" і "выхаванне", пісаў нямецкі навуковец Г.Нойнер. На яго думку, гэта пера- шкаджае і развіццю педагогікі, і выкладанню педагагічных дысцыплін [11].

У той жа час у "Советском энциклопедическом словаре" (М., 1984) адукацыя па-ранейшаму вызначаецца як "процесс и результат усвоения систематизированных знаний, умений и навыков; необходимое условие подготовки человека к жизни и труду". І далей: "Основной путь получения образования – обучение в учебных заведениях, где оно тесно связано с воспитанием" [15, с. 907].

Беларускі навуковец І.Ф.Харламаў у падручніку па педагогіцы разглядаў адукацыю не толькі як працэс і вынік авалодання навучэнцам ведамі, уменнямі і навыкамі, але і як працэс і вынік "развития мировозрения, идейно-политических взглядов и нравственности, а также творческих задатков и способностей, в результае чего он приобретает ... образ и индивидуальное своеобразие" [17, с. 101]. Як бачна, у яго вызначэнні адукацыя ахоплівае працэсы навучання (авалоданне ведамі, уменнямі, навыкамі), выхавання (фарміраванне светапогляду, ідэйна-палітычных поглядаў і маральнасці), развіцця (развіццё творчых задаткаў, здольнасцей, набыццё індывідуальнай своеасаблівасці).

Праблема сістэматызацыі педагагічных паняццяў і тэрмінаў заставалася актуальнай і ў 1990-я гг. Педагогіка бурна развівалася, і гэты працэс суправаджаўся дыферэнцыяцыяй існуючых і з'яўленнем новых паняццяў. У навуцы назіралася імкненне да звядзення да мінімуму колькасці катэгорый у кожнай навуковай дысцыпліне, актывізаваўся працэс узаемапранікнення паняццяў прыродазнаўчых, грамадскіх і тэхнічных навук. Аб гэтым сведчыць змест энцыклапедычных выданняў: "Словарь терминологии образования взрослых" (М., 1993), "Российская педагогическая энциклопедия" (М., 1993), "Психоло-го-педагогический словарь" (Ростов-на Дону, 1998) і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Свой шлях вырашэння паняційна-тэрміналагічнай праблемы ў педагогіцы прапанаваў В.С.Ляднёў. На яго думку, у 1970–1980-я гг. “в отношении основных категорий педагогики сложилась терминалогическая неразбериха” [7, с. 343]. Ён разглядае паняцце “адукацыя” ў шырокім значэнні, калі яно змыкаецца з паняццем “фарміраванне асобы”. Паводле яго меркавання, выкарыстоўваць тэрмін “адукацыя” трэба для абазначэння працэсу станаўлення асобы, адмовіўшыся ад выкарыстання для гэтага тэрміна “выхаванне” ў шырокім сэнсе. У выніку тэрмін “выхаванне” будзе выкарыстоўвацца толькі ў вузкім сэнсе для абазначэння фарміравання валявых і іншых тыпалагічных уласцівасцей паводзін чалавека [6, с. 23]. Гэта дазволіць таксама адмовіцца ад выкарыстання тэрміна “адукацыя” ў вузкім сэнсе як сіноніма тэрміна “навучанне”.

Для абазначэння выніку працэсу станаўлення асобы, г. зн. выніку адукацыі, выніку сукупнага цэласнага трыадзінага працэсу навучання–выхавання–развіцця, В.С.Ляднёў прапануе тэрмін “асоба”. Такім чынам, паняцце “адукацыя” прапануецца выкарыстоўваць толькі для абазначэння працэсу, а не выніку.

Адукацыя, па яго вызначэнні, – “это общественно организуемый и нормируемый процесс постоянной передачи предшествующими поколениями последующим социально значимого опыта, представляющий собой в онтогенетическом плане биосоциальный процесс становления личности. В этом процессе, характеризующемся содержанием, формами и методами, выделяются три основных структурных аспекта: познавательный, обеспечивающий усвоение опыта личностью; воспитание типологических свойств личности, а также физическое и умственное развитие. Ведущей деятельностью в образовании является учебная” [7, с. 52–53].

У той жа час В.С.Ляднёў лічыць, што перадача–засваенне вопыту, выхаванне і развіццё – гэта тры бакі базавай катэгорыі “навучанне”: “... процесс обучения, как и образования, триедин; он характеризуется и усвоением опыта (знания и умения), и воспитанием, и развитем” [6, с. 43]. Аўтар прапануе выдзеліць іх з паняцця “навучанне”.

На наш погляд, выхаванне, навучанне і развіццё – раўнапраўныя катэгорыі, якія ў сваім адзінстве ўтвараюць працэс адукацыі. Іх суадносіны паміж сабой няпростыя: выхаванне і развіццё адбываюцца ў працэсе навучання, навучанне – галоўны фактар выхавання і развіцця асобы, але выхаванне і развіццё асобы могуць здзяйсняцца і па-за межамі арганізаванага працэсу навучання.

Удакладненне паняцця “адукацыя“ ў даведачнай і навуковай літаратуры працягваецца і ў апошні час. У сучаснай педагагічнай літаратуры адукацыю прынята разглядаць як «пабудову ўласнага “Я”». Яна разглядаецца ў некалькіх узаемазвязаных аспектах: 1) як адукацыйны працэс, 2) як індывідуальны і калектыўны вынік адукацыйнага працэсу (адукаванасць), 3) як адукацыйная сістэма [3]. Гэтыя тры аспекты паняцця “адукацыя” названы і ў “Психолого-педагогическом словаре” В.А.Міжэрыкава (Ростов-на Дону, 1998): адукацыя як “относительный результат процесса обучения”, як “процесс изменения, развития, усовершенствования сложившейся системы знаний и отношений на протяжении всей жизни”, як “целенаправленный процесс воспитания и обучения в интересах человека, общества, государства” [13, с. 282].

Усімі навукоўцамі падкрэсліваецца цесная сувязь адукацыі з культурай. Культура разумееца як сістэма ўзораў паводзін, свядомасці людзей, прадметаў і з'яў у жыцці грамадства, якая ўзнаўляецца пры змене пакаленняў. Прынцып культурaадпаведнасці, сфармуляваны яшчэ А.Дыстэрвегам, вызначае змест сучаснага адукацыйнага працэсу, арыентацыю адукацыі на каштоўнасці культуры, асваенне яе дасягненняў і яе ўзнаўленне, на прыняцце сацыякультурных нормаў і ўключэнне чалавека ў іх далейшае развіццё. Праз адукацыю адбываецца ўзнаўленне культуры і ў той жа час у адукацыйным працэсе ствараецца кантэкст культуры. Развіццё і функцыянаванне культуры і адукацыі абумоўліваюцца эканамічнымі, палітычнымі, сацыяльнымі і іншымі ўмовамі існавання грамадства [14, с. 20].

Пачатак XXI ст. характарызуецца імкненнем навукоўцаў да пошуку новых падыходаў і парадыгмаў пры вырашэнні адукацыйных, у тым ліку і паняційна-тэрміналагічных праблем. Адукацыйныя працэсы, якія забяспечваюць засваенне навучэнцамі пэўных ідэальных мадэлей, пэўнага складу мыслення, духоўнасці, разумнасці, павінны адпавядаць асаблівасцям развіцця грамадскай свядомасці і сучаснага грамадства ўвогуле. Актывізуецца дзейнасць па вырашэнні метадалагічных праблем педагагічнай навукі. Напрыклад, інавацыйную парадыгму сучаснай адукацыі прапанавала расійскі навуковец М.Ц.Грамкова [1].

На яе думку, працэсы здзяйснення і асэнсавання ўзаемадзеяння чалавека з навакольным светам адбываюцца ў адукацыйнай прасторы, якая праз органы пачуццяў судакранаецца з нашай свядомасцю, успрымаецца, запамінаецца, асэнсоўваецца. Акружаючы нас цэласны свет –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

складаная сістэма з элементамі-сферамі, прасторамі “бія” (прырода), “сацыя” (грамадства) і “дух” (духоўная прастора) у іх суаднесенасці, раўназначнасці і гармоніі. Структура ўнутранага вобраза чалавека адпавядае структуры навакольнага свету: суб’ект адукацыі па сваёй унутранай структуры ёсць складаная сістэма, якая спалучае элементы *індывід–асоба–чалавек* у адпаведнасці з элементамі навакольнага свету *бія–сацыя–дух* у іх адзінстве і цэласнасці.

Такім чынам, па меркаванні М.Ц.Грамковай, працэс адукацыі – працэс змянення ўнутранага вобраза чалавека ў адпаведнасці з культурай пры асэнсаванні сябе ў навакольным свеце – адбываецца ўсюды і заўсёды як асэнсаванне самога сябе, знешняга свету і іх кантынуума; адукацыйны працэс – гэта асэнсаванне суб'ектам навакольнага свету і ўзаемадзеяння з ім, асэнсаванне ўласных дзеянняў, у выніку чаго ў яго змяняюцца патрэбнасці, нормы, здольнасці. Асэнсаванне адбываецца часцей за ўсё без удзелу педагогаў-прафесіяналаў і прыводзіць да пэўных вынікаў, якія залежаць ад умоў жыцця, яго рэалій. Адпаведна мэта адукацыі – забеспячэнне гарманічнага існавання суб’екта адукацыі (індывіда–асобы–чалавека) з навакольным светам (прыродай–грамадствам–духоўнай прасторай) у іх адзінстве і цэласнасці, суаднесенасці і раўназначнасці, у іх гармоніі.

Педагогіка – навука аб спецыяльна арганізаваных адукацыйных працэсах. Таму прадметам педагагічнай навукі з’яўляецца педагагічны працэс – мэтанакіравана арганізаваны спецыялістамі ў адпаведных умовах (у навучальных установах) адукацыйны працэс змянення ўнутранага вобраза суб’екта адукацыі. М.Ц.Грамкова падкрэслівае, што педагагічнае ўзаемадзеянне суб’ектаў педагагічнага працэсу (выкладчыкаў і навучэнцаў) здзяйсняецца ў цэласным спалучэнні працэсаў выхавання, навучання і развіцця, якія цесна ўзаемазвязаны, утвараюць адзінства і цэласнасць, адбываюцца ўсюды і заўсёды. Таму педагагічны працэс у навучальнай установе – спецыяльна (тэхналагічна) арганізаваны, пазітыўна-выніковы адукацыйны працэс, які складаюць выхаванне, навучанне і развіццё.

Вынікам працэсу ўзаемадзеяння суб'екта адукацыі з навакольным светам з'яўляецца змяненне яго вобраза, яго свядомасці. А змяненне свядомасці ў педагагічным працэсе – гэта змяненне патрэбнасцей (выхаванне), нормаў (навучанне), здольнасцей (развіццё). Вынікам гэтых працэсаў з'яўляецца пэўны ўзровень духоўнасці, авалодання сацыякультурнымі нормамі, узровень цывілізаванасці [1, с. 229–239].

Такі падыход да ўдакладнення сістэмы ўзаемазвязаных паняццяў, на наш погляд, дазваляе пераадолець тэрміналагічную блытаніну, забяспечвае стройнасць і дакладнасць пры выкладанні навукова-педагагічных ведаў у курсе педагогікі і можа стаць метадалагічнай асновай для правядзення навукова-педагагічных даследаванняў.

---


*1. Громкова М.Т.* Психология и педагогика профессиональной деятельности. – М.: ЮНИТИ-ДАНА, 2003. – 415 с.

*2. Занков Л.В.* Дидактика и жизнь.– М.: Просвещение, 1968. – 175 с.

*3. Зимняя И.А.* Педагогическая психология. – Ростов н/Д.: Феникс, 1997. – 480 с.

*4. Каптерев П.Ф.* Избранные сочинения. – М.: Педагогика, 1982. – 704 с.

*5. Коменский Я.А., Локк Д., Руссо Ж.-Ж., Песталоцци И.Г.* Педагогическое наследие / Сост. В.М.Кларин, А.Н.Джуринский. – М.: Педагогика, 1989. – 416 с.

*6. Леднев В.С.* Содержание образования: сущность, структура, перспективы. – 2-е изд., перераб. – М.: Высш. шк., 1991. – 224 с.

*7. Леднев В.С.* Содержание образования. – М.: Высш. шк., 1989. – 360 с.

*8. Ленин В.И.* О личности и воспитании.– М.: Политиздат, 1988. – 286 с.

*9. Луначарский А.В.* О воспитании и образовании.– М.: Педагогика, 1976. – 636 с.

*10. Маркс К., Энгельс Ф., Ленин В.И.* О коммунистическом воспитании.– М.: Политиздат, 1984. – 288 с.

*11. Нойнер Г.* Вопросы теории социалистического общего образования.– М.: Педагогика, 1975. – 238 с.

*12. Педагогическая* энциклопедия: В 4 т. – М.: Изд-во «Советская энциклопедия», 1966. – Т. 3. – 912 с.

*13. Психолого-педагогический* словарь /Авт.-сост. В.А.Мижериков. – Ростов-на Дону: Феникс, 1998.– 544с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*14. Социально-философские* проблемы образования: Сб. статей / Исслед. центр по пробл. управления качеством подгот. специалистов; [ред.-сост.: Н.Н.Пахомов, Ю.Б.Тулталов]. – М.: Изд. фирма «Логос», 1992. – 189 с.

*15. Советский* энциклопедический словарь. – М.: Сов. энц., 1984. – 1600 с.

*16. Ушинский К.Д.* Педагогические сочинения: В 6 т. – М.: Педагогика, 1988. – Т. 2. – 496 с.

*17. Харламов И.Ф.* Педагогика.– Мн.: Изд-во БГУ, 1979. – 462 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ